Імя Юстына Карпіловіч яшчэ мала каму вядомае. Хоць яе голас і сьпевы многія ўжо маглі чуць, а некаторыя пасьпелі запомніць. Хтосьці заўважыў яе на фэсьце “Прадмова”, камусьці яна запомнілася на канцэрце “Грай”, нехта пазнаёміўся зь яе творчасьцю зь перадачаў “Белсата”, “Еўрарадыё” ці радыё “ЎНЭТ”. Адзінае, што можна сьцьвярджаць – яе песьні не прайшлі незаўважанымі. Ня гледзячы на свой юны ўзрост (15 гадоў), пясьнярка мае ў сваім багажы ўжо некалькі дзесяткаў песень. Гэта песьні-рэфлексіі. Рэфлексіі дзяўчынкі на тое, што адбываецца зь яе краінай і як гэта адбіваецца на яе сябрах і родных.

https://www.youtube.com/watch?v=4YM27dSIlYg

Сямейны гурт "Бартосікі" існуе ад незабыўнага лета 2020 года. Самыя лепшыя выступленні адбыліся ў восеньскіх менскіх дварах. У час, калі жыхары Беларусі адчулі сябе беларусамі. На тых дваровых канцэртах была самая ўдзячная публіка ва ўсіх беларускіх артыстаў. Мы сьпявалі народныя, аўтарскія, перакладныя песьні. На сваім канцэрце мы хочам аднавіць тую п'янкую атмасфэру вольнага менскага двара.